Как слонимские родители становятся «кукушками» на стр. 2

Слонимский «Коммунальник» — гроза авторитетов? на стр. 3

Новый рассказ Алексея ЯКИМОВИЧА на стр. 5




Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Выходзіць з 1997 года.

№ 18 (47). Слонім. 1 — 7 траўня 1998 г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік Кошт свабодны

ПОМЯНУЛИ ПРЕДКОВ



28 апреля слонимчане отметили Радуницу — стародавний день памяти предков, который зародился в далекие дохристианские времена.

По обычаю, Радуница отмечается на девятый день после Пасхи, то есть во вторник после Пасхальной недели. По традиции, в понедельник, после полевых работ и обрезки деревьев в саду, белорусы приводили в порядок могилы родных и близких. Во вторник с утра готовилась обрядовая пища, а после полудня каждая семья шла поминать родственников сначала в церковь, а затем на кладбище. На могильном холмике, устланном льняной скатертью или рушником, начинали поминки. На скатерть среди прочих яств обязательно ставили кутью, хлеб и соль у зажженной свечи, вели тихую беседу, вспоминали, голосили, если смерть близкого была недавней; могилу окропляли водкой и по ней крест-накрест катали пасхальное яйцо. После чего яйца, немного водки и пищи оставляли предкам. Все это обычно доставалось птицам. Их белорусы считали своеобразными «связными» между живыми и мертвыми. После кладбища поминовение завершалось застольем дома или в трактире, где развеивали тоску. Поэтому в народе говорили: «На Радуницу до обеда пашут, после обеда плачут, а вечером скачут». Накануне и в Радуницу люди старались одаривать нищих и неимущих.

Упершыню

Сёлетняя Правадная нядзеля ў вёсцы Вострава была адметная тым, што упершыню на вясковых могілках сваіх нябожчыкаў "памянулі" мясцовыя культработнікі.

Перад тым, як бацюшка асвяціў магілы, загадчыкі клуба і бібліятэкі зачыталі прозвішчы і ўспомнілі добрым словам калгасных ветэранаў, якія пакінулі гэты свет.

М.К.

ЖАХ



На могілках вёскі Сакалова (на здымку) невядомыя вандалы разбурылі магілу напярэдадні Радаўніцы. Што шукалі бязбожнікі на месцы даўняга пахавання?

АФІЦЫЙНА

■ Министерство по чрезвычайным ситуациям намерено ходатайствовать перед президентом страны о возобновлении ряда льгот для ликвидаторов чернобыльской аварии.

■ По данным федерации профсоюзов Беларуси, сумма задолженности государства трудящимся превысила 1 триллион рублей, каждый 8-й работник не получает вовремя заработанные деньги.

■ Президент А.Лукашенко провел совещание с представителями правительства, на котором обсудил проект указа об обеспечении ответственных лиц служебным жильем.

По мнению А.Лукашенко, пришло время этот документ принять, согласно которому должностное лицо, приезжая на работу или переезжая, получает служебную квартиру, а, отработав, сдает ее и возвращается в прежнее жилье. Согласно проекту указа, должностные лица будут обеспечиваться служебными квартирами без права их отчуждения, продажи и приватизации.

■ На прошлой неделе (20-26 апреля) курс доллара США к белорусскому рублю повысился на всех секторах валютного рынка, за исключением межбанковского.

На «черном» рынке в Минске средние наличные котировки американской валюты выросли на 2% (с 50 000 – 52 000 до 51 000 – 53 000 рублей), а в обменных пунктах коммерческих банков – на 0,7% (с 45 600 – 46 100 до 45 800 – 46 500). Также на 0,7% (с 34 370 до 34 620 рублей) подорожал доллар США на Минской межбанковской валютной бирже.


Немецкая марка на МВБ прибавила в цене 1,0% (рост с 19 050 до 19 250), российский рубль – 0,9 процента (с 5 590 до 5 640). Украинская гривна подешевела на 1,3 процента (с 34 300 до 33 850). Средние котировки доллара США на межбанковском рынке снизились на 2,2 процента (с 68 000 – 70 000 до 66 500 – 68 500 рублей).

За 26 дней апреля «черный» курс доллара вырос на 11,8%, банковский – на 6,1%, внебиржевой – на 5,1%, биржевой – на 2,7%.

БелаПАН

Монастырское поле

В Слонимском районе есть одна категория сельских тружеников, которая сейчас сеет без особой суеты, поделовому, не дожидаясь селекторного совещания.



...За стенами Жировичского монастыря тихо, как будто и не весна на дворе. Все идет по уставу, установленным порядком. Деловито снуют паломники (люди, которые специально приезжают сюда, чтобы пожить и поработать во благо монастыря) и послушники, целенаправленно перемещаются отрешенные, погруженные в себя монахи. Прозрачный, окрыленный многовековой грустью, плывет над Жировичами звон колоколов, уже три столетия призывающий задуматься о вечном.

Все так, словно и не нужно в сжатые сроки засеять свои 100 га пашни, которые потом будут кормить братию и три с лишним сотни студентов семинарии — людей молодых, растущих, нуждающихся в усиленном питании.

(Продолжение на стр. 2)

ГОРАД

А вінаватых няма



26 красавіка ў цэнтры Слоніма прайшоў пікет, прысвечаны 12-м угодкам Чарнобыльскай трагедыі.

Арганізатары — сябры БНФ "Адраджэнне" — на працягу дзвюх гадзін трымалі плакаты наступнага зместу: "Хто адкажа за смерць нашых дзяцей?", "Хварэюць сотні тысяч дзяцей ад Чарнобыля і вінаватых няма", "Павысіць заробак, пенсіі, спыніць штодзённы рост цэнаў!" і іншыя. Падчас пікету ўдзельнікі распаўсюджвалі ўлёткі і газеты, збіралі подпісы пад Хартыяй-97.

А.М.

Нужна обходная магистраль

В Слониме назрела острая необходимость строительства объездной магистрали.

Об этом шел разговор на очередном заседании Гродненского облисполкома в связи со сложной обстановкой с безопасностью движения на магистральных дорогах нашей области. Технические параметры и обустройство автодорог на многих участках не отвечают требованиям безопасности дорожного движения.

Михаил ОКУЛКО

ЗДАРЭННІ

Адзін дакурыўся...

22 красавіка загарэлася кватэра па вуліцы Пушкіна.

Высветлілася, што пажар узнік у выніку неасцярожнасці курыльшчыкаў. Кватэранаймальнік Сяргей Д., "згубіў" запаленую цыгарэту, ад якой і загарэўся дыван. На шчасце, ніхто не пацярпеў.

...другі дагуляўся

У панядзелак, 27 красавіка, у вёсцы Жыровічы згарэў хлеў.

Пакуль дарослыя рыхтавалі бульбу для пасадкі, праўнук-першакласнік выршыў пагуляць з агнём...

Віктар ЗІМНІЦКІ

Абыйшлося без ахвяр

25 красавіка вадзіцель легкавушкі, які выязджаў з Опернай вуліцы, парушыў правілы дарожнага руху і сутыкнуўся з аўтамабілем, які рухаўся па вуліцы Я.Купалы.

У выніку дзве машыны былі пашкоджаны.

У гэты ж дзень падобная аварыя здарылася і каля вёскі Сакалова.

У двух выпадках людзі не пацярпелі.

Застаўся без транспарту

У нядзелю жыхар вёскі Азярніцы М., як звычайна, вечарам паставіў свой веласіпед у хлеў.

А калі раніцай ён сабраўся пад'ехаць у краму, то жахнуўся: яго двухколку нехта ўкраў.

Валянцін ЧУРЫЛА

Монастырское поле

Монастырь — организация не бюджетная, скорее хозрасчетная. Тут-то уж митинговать есть все основания: не вырастишь — никто не даст. Хоть с голоду помирай. А думать о вечном можно, только если в трапезной расторопная, приветливая повариха наполнит тарелку чем-то наваристым.

Но здесь не митингуют. Хотя тишина и кажущаяся. Хозяйственная жизнь тут бурлит, словно многочисленные омуты в недалекой Щаре. Ремонтируется техника, накапливаются удобрения, строятся хранилища, доятся коровы, печется хлеб...

—Конечно, непросто накормить три с половиной сотни душ. Но мы с Божьей помощью всегда обеспечивали себя, — говорит отец Агафокл, эконом монастыря, в единственном лице осуществляющий на 170 гектарах сельхозугодий правительственные штабы, комиссии, Комитет госконтроля и Совет безопасности. — Картошкой, мясом, зерном, овощами... Овощами, правда, только до осени. Отсеемся и в этом году.

Собственно говоря, почему не отсеяться: у монастыря неплохая база — 4 трактора МТЗ, 2 немецких, комбайн "Нива", сеялка, навесной и прицепной инвентарь, коровник, другие хозяйственные помещения. Все, правда, пожертвованное, то есть не новое. Но на 170 гектаров угодий этого вполне хватает. Как хватает пока и земли. За 300-летнюю историю монастыря были времена, когда половина здешних земель принадлежала братии. В недавние годы, которые здесь скромно именуют богоборческими, их обрезали по самое никуда — живите, как хотите.

Теперь власти опять расщедрились и нужное количество земли постепенно дают. Правда, дают, как жертвуют — чаще всего самое худшее. И монастырь получает участки по болотам, по низинам с балльностью просто катастрофической. Но жаловаться тут не принято, и братия безропотно работает на своих полях.

Результаты? В минувшем году получено по 26 центнеров с гектара зерновых. Если помнить, что земли худшие, а состав работающих непостоянный — все больше паломники и послушники, — это очень неплохо. Тем более, что особенных технологических новинок тут не знают. Только-только взяли на работу агронома. А так все больше — по старинным рецептам.

Наверное, со временем будут технологии. Пока же залог успеха один: здесь работают заинтересованно! Так, как работают, пожалуй, только фермеры и верующие.

—Я в совхозе-техникуме "Жировичи" с детства, — говорит Александр Синяк, исполняющий обязанности главного механика монастыря. — Зарабатывал там больше. Но отсюда никуда не уйду — тут все иначе, душевный интерес есть ко всему.

Не он один в этом убежден. Местные женщины, как о выигрыше по лотерейному билету, мечтают пристроить своих мужиков в монастырь на работу. С утра пьяненький колхозный механизатор здесь либо превращается во вполне серьезного специалиста и почтенного главу семейства, либо тихо вытесняется на прежнее место. Чаще первое.

В монастыре пить и гулять, прелюбодействовать или каким-то иным образом совершать то, что именуется грехом, просто некогда. И нравственность и трудолюбие поддерживает экономический интерес: не заработаешь — не проживешь.

Здесь от соблазнов отгородились высоким забором и религиозными канонами. И применительно к монастырскому хозяйству это действует безотказно.

На здешней ферме 35 голов крупного рогатого скота. Бывший токарь из Борисова Александр Маркевич, уже два года живущий в монастыре в качестве паломника, и его помощники управляются с ними вполне уверенно — под руководством зоотехника местного совхоза. Дает продукцию рыбный пруд, пасека, скоро начнет обеспечивать своим хлебом пекарня.

Все это как бы из воздуха, частью от нещедрых пожертвователей, но в основном через нелегкий труд, основанный на душевном интересе. О деньгах здесь говорить не принято. И зарплаты (если и платят), по нашим меркам, очень смешные.

Агроном по образованию, Михаил заведует монастырскими огородами. На двух с лишним гектарах выращивает капусту, огурцы, помидоры, свеклу. Все то, что мать Степанида, работающая, по словам Михаила, во славу Божию, потом засаливает, квасит — заготавливает впрок. Не потребляющие мяса и молока монахи ее соленья очень любят.

—Я тут уже пять лет, — говорит Михаил.

—А еще сколько пробудете?

—Сколько Господь велит.

Под весенним дождем паломник лопатой чистит недавно спущенный пруд.

—Что это он под дождем? Переждал бы... Или задание такое?

—Нет, его никто не заставляет работать. Просто сам хочет поскорее рыбу запустить сюда.

Вот организация почти уникальная: никто не ходит с палкой, а дело кипит!

Практически без средств (монастырь — организация не коммерческая, зарабатывать деньги права не имеет), в основном своим трудом живет немалый коллектив в три с лишним сотни человек. Почти колхоз — не очень малый, если брать по количеству работающих. Ни копейки дотаций, никаких кредитов. И живет!

Может взять и все колхозы обратить в монастыри?

Анатолий ГУЛЯЕВ,
специально для "ГС"

ІНФАРМБЮРО

Здоровый клубень — надежный урожай

Уже который год на своем дачном участке я не могу получить хороший урожай картофеля. Соседка сказала, что моя земля заражена нематодой. Так ли это?

Наталья Сафронова,
Слоним

Картофель у нас – основная продовольственная культура, и большинство людей обеспечивают себя клубнями за счет приусадебных участков.

Только в Слонимском районе в 1998 году площади под приусадебными, дачными и огородными участками почти удвоилась и теперь занимают 5034 га или 10% от всей пашни района. С этих участков люди получают до 60% всего накапываемого картофеля в районе.

Казалось бы, это хорошо – да не совсем. При таком интенсивном насыщении полей одной культурой накапливается инфекция многих болезней. Особенно вредит картофельная нематода. К сожалению, эта беда поразила многие приусадебные и дачные участки.

Сложность борьбы с картофельной нематодой состоит в том, что она способна сохраняться в почве до 10-15 лет и переносится на новые участки с частицами почвы, приставшей к клубням, орудиям обработки, ногам животных и человека, переносится ветром, дождевыми потоками. Урожайность на сильно зараженных участках при бессменном выращивании картофеля неустойчивых к нематоде сортов снижается в 2-3 раза, а при сильном заражении – и семян не собрать.

Наиболее эффективная мера борьбы с картофельной нематодой – внедрение нематодоустойчивых сортов "Белорусский-3", "Росинка", "Верас", "Сантэ". Те, кто имеет эти сорта, уже убедились, что на зараженных участках урожайность их в 2-3 раза выше, чем сортов, неустойчивых к нематоде. А уровень зараженности почвы уже в первые 1-2 года снижается на 50-60%. Эти сорта имеются в колхозах и совхозах района. Их можно купить в элитхозах области. В том случае, если вы приобрели семена у частных лиц, их необходимо старательно промыть, высушить и только после этого высаживать. Это даст возможность избежать заражения.

Алексей ФИЛИПЧИК,
государственный инспектор по карантину растений

Правілы для ўсіх

"Ці можа супрацоўнік міліцыі, не інспектар ДАІ, без падстаў спыніць вадзіцеля транспартнага сродку?"

Марына Аляксандраўна КУПІЧ,
Слонім

Адказ на гэтае пытанне дае начальнік МРЭА ДАІ Васіль Пазняк:

"Згодна п.3.33 раздзела 3 Правіл дарожнага руху, вадзіцель транспартнага сродку абавязаны па патрабаванню супрацоўнікаў міліцыі спыніцца і перадаваць ім, а таксама дружыннікам і пазаштатным супрацоўнікам міліцыі дакументы для праверкі...

Знак аб спыненні транспартнага сродку падаецца жазлом, альбо зразумелым жэстам рукі".

НАВІНЫ

Шосты дабрачынны канцэрт

Выкладчыкі і вучні дзіцячай музычнай школы далі дабрачынны канцэрт.

Гэта ўжо шостае падобнае выступленне. Прадалі тысячу білетаў, але жадаючых пабываць на канцэрце было значна больш, таму глядзельная зала была запоўнена да адказу. Па словах старшыні раённага савета жанчын Лізаветы Мукасей, сродкі ад канцэрта пойдуць у фонд дапамогі жанчынам-інвалідам.

Валянцін ЧУРЫЛА

Настаўнік павінен быць багатым

Прэзідэнт савета дырэктароў школ Рэспублікі Беларусь Уладзімір Разумовіч два дні, 29 і 30 красавіка, сустракаўся з дырэктарамі сельскіх школ Слонімшчыны і з работнікамі раённага аддзела адукацыі.

Сам Уладзімір Мікалаевіч працуе дырэктарам экалагічнай гімназіі №3 г.Баранавічы, пабываў у многіх краінах свету, дзе пераймаў педагагічны вопыт. Таму сельскім настаўнікам яму было што расказаць. Сустрэча праходзіла ў форме дыскусіі. На пытанне, якім павінен быць сёння дырэктар школы, адказ з вуснаў Уладзіміра Разумовіча быў адзін: "Багатым!".

Міхась АКУЛКА

ЗДАРЭННЕ

"Цырк" на вуліцы Анішчыка

Па словах аднаго з жыхароў вуліцы Анішчыка, у нядзелю тут адбывалася нешта падобнае на цыркавое прадстаўленне.

Адзін ягоны сусед на добрым падпітку цэлую гадзіну ганяў сваю сужыцельку вакол хаты. А калі дагнаў, то добра яе адлупцаваў.

За што дасталося беднай кабеце? На гэтае пытанне крыўдзіцелю, відаць, прыйдзецца адказваць у міліцыі, бо па словах суседзяў, менавіта туды жанчына звярнулася па дапамогу.

Валянцін ЧУРЫЛА

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК.

Адрас рэдакцыі:
231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэл. 2-14-39.
E-MAIL: gs@irex.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 30 красавіка 1998 г.
Час падпісання 8:00.
Надрукавана ў Баранавіцкай узбуйненай друкарні, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80.

Падпісны індэкс 64042.
Наклад 6.600 экз.
Заказ № 1349.

ПРАБЛЕМА

Бацькі-зязюлі

У судзе мне паказалі пяць спраў аб нявыплаце аліментаў. Пяць людскіх лёсаў. У кожнай папцы стос даведак, запытаў, характарыстык, прачытаўшы якія, можна ўявіць сабе, хто гэтыя людзі.

А як прыгожа ўсё пачыналася. Каханне. Сустрэчы. Вяселле. Нараджэнне дзіцяці. Здавалася б, жыві, радуйся ды гадуй дзетак, працягвай свой род.

На жаль, так адбываецца не заўсёды. Першая сямейная сварка, высвятленне адносінаў, непаразуменне, нянавісць і ...развод.

Складаная і непрадказальная рэч — жыццё. Разышліся муж з жонкай і сталі нібы чужымі, нават ворагамі. Кожны пачынае будаваць жыццё па-новаму.

Але часцей бывае так, калі пасля распаду сям'і на руках у маладой маці застаецца малое дзіця, якому бацька павінен плаціць аліменты. Вось тады, часцей за ўсё, бацькі і паказваюць свой сапраўдны твар. Многія з іх не жадаюць плаціць грошай і, часам, знікаюць у невядомым напрамку.

Так зрабіў, напрыклад, слонімец Ёрш С.М., які скасаваў шлюб з дзвюма былымі жонкамі, пакінуўшы кожнай з іх па сыну. Ні на аднаго з хлопчыкаў не плаціць аліменты. Нідзе не працуе. Апошнім ягоным месцам работы была фабрыка гасціннай мэблі, адкуль ён звольніўся ў 1993 годзе. Ажаніўся трэці раз і дзе цяпер знаходзіцца, невядома. Судовыя выканаўцы даўно аб'явілі на яго вышук. Канец гэтай гісторыі для Ярша С.М. можа быць сумным: яго прыцягнуць да крымінальнай адказнасці, могуць асудзіць на два гады пазбаўлення волі.

Такі ж лёс чакае ў далейшым і яшчэ чатырох злосных неплацельшчыкаў аліментаў.

Яраша А.К. звольнілі з працы яшчэ ў красавіку 1996 года за "з'яўленне на рабоце ў нецвярозым стане". Яго двойчы папярэджваў суд аб крымінальнай адказнасці за нявыплату аліментаў, аднак гэта ён праігнараваў. Цяжка зразумець думкі такіх бацькоў, як Яраш, якія, відаць, згодны сесці ў турму, абы толькі не плаціць грошы на выхаванне ўласных дзяцей.

Па словах старшага судовага выканаўцы Вольгі Бяссмольнай, ад мужчын пасля разводу можна пачуць такія выказванні: "Я ёй (г.зн. былой жонцы) ні рубля не дам". А мне падумалася: а чаму "ёй", а не свайму дзіцяці? Гэта жонка можа стаць "былой" (усяляк бывае ў жыцці), а сын, ці дачка "былымі" быць не могуць: яны заўсёды нашы дзеці.

Многія мужчыны выказваюць незадавальненне: маўляў, некалькі месяцаў не заплаціў аліментаў і ў турму? Не, не адразу ў турму. Цярплівасці судовых выканаўцаў можна толькі пазайздросціць. З месяца ў месяц яны пасылаюць папярэджанні з просьбамі заплаціць аліменты, падлічваюць запазычанасць неплацельшчыкаў і нават дапамагаюць некаторым з іх уладкавацца на працу. І толькі, калі ўсе метады не дадуць пэўнага выніку, узбуджаецца крымінальная справа.


Невядома, на што разлічвае жыхар вёскі Мыслава Куляшэвіч І.М., якога летась звольнілі з работы за п'янства. На працу ён не ўладкаваўся, аліментаў на выхаванне сваёй дачкі не плаціць. Аднак на гарэлку сродкі знаходзіць. Нават, калі захварэў і трапіў у бальніцу, не перастаў піць спіртное, за што быў выпісаны датэрмінова за парушэнне бальнічнага рэжыму...

Тры з паловай мільёны рублёў складае запазычанасць па аліментах у Давыдзіка А.А., які таксама нідзе не працуе з 1996 года. Перад пачаткам навучальнага года былая жонка Давыдзіка звярнулася ў суд і прасіла дапамагчы ёй спагнаць аліменты з былога мужа, каб падрыхтаваць дзіця ў школу. Аднак бацька не адгукнуўся на гэтую просьбу.

Не плаціць аліментаў на сваіх дзяцей дваім былым жонкам і Суцько А.Р. Каб утаіць заробак, ён паехаў працаваць у адзін з калгасаў Свіслацкага раёна. Апошняя сума, якую змаглі атрымаць ад яго дзеці, склала ўсяго 142 тысячы рублёў. Хіба магчыма на такія грошы выхаваць дзіця?..

У судзе працуюць чатыры судовыя выканаўцы і ў кожнага ў вытворчасці знаходзіцца да 50 спраў "аліменшчыкаў". І трывожна тое, што з кожным годам бацькоў-зязюль становіцца ўсё больш.

Валянцін ЧУРЫЛА



ФУТБОЛ. ВЫСШАЯ ЛИГА

НИЧЬЯ НА ВЫЕЗДЕ

Динамо (Брест) — Коммунальник (Слоним) — 0:0

Брест. 25 апреля. 5000 зрителей.
Судья В.Матюшев (нк, Минск).
Коммунальник: Киркиж, Пашкевич, Баль (к), Янковский (Феоктистов — в 1 тайме), Капанец, Цыбулько, Савицкий, А.Дегиль, Шупилов, Дым (Врублевский — во 2 тайме, его заменил Киреня), Татарашвили.
Предупреждения: Капанец, Цыбулько.
Конкурс "ГС" и ООО "Телкон": лучший игрок — Савицкий, бомбардира нет, лучший новичок — Шупилов.

Лишь самые большие оптимисты могли предположить, что "Коммунальник" в игре в Бресте с местным "Динамо", лидером чемпионата, не проиграет. А получилось так, что слонимчане показали хорошую игру и могли выиграть...

По словам главного тренера "Коммунальника" Алексея Шубенка, наши футболисты в Бресте, в основном, играли от обороны. Против атакующей линии "Динамо" было выставлено 6 (!) защитников "Коммунальника". Даже нападающий Олег Савицкий отыграл матч как защитник. А в нападении был только Георгий Татарашвили. Поэтому слонимчане играли на контратаках.

В первом тайме "Коммунальнику" пришлось нелегко, но наши футболисты выстояли перед натиском хозяев поля. А во втором — слонимчане провели несколько стремительных контратак. На 60-ой минуте в штрафной площадке "Динамо" сбили Татарашвили и в ворота хозяев был назначен пенальти. Но Дыму не удалось его реализовать.

—Мы очень боялись, что после этой неудачи ребята дрогнут, психологически сломаются, но они выстояли, — говорит А.Шубенок. — Более того, в конце матча гол мог забить Сергей Врублевский, который вышел с вратарем "Динамо" один на один. Но ему не повезло...

В итоге — "Коммунальник" взял первое, важное очко в этом чемпионате. Более того, у лидера и на чужом поле. Поэтому к следующей игре с солигорским "Шахтером", которая пройдет 4 мая на слонимском стадионе (начало в 17.30), наши ребята настроены по-боевому, желая реабилитироваться перед своими болельщиками за домашнее поражение от борисовского БАТЭ.

Сергей ЁРШ

Результаты остальных матчей тура:
Динамо-93 — Славия — 4:0, БАТЭ — Нафтан-Девон — 2:1, Локомотив-96 — Днепр-Трансмаш — 0:1, Гомель — Белшина — 1:0, Торпедо Мн. — Неман — 3:1, Торпедо-Кадино — Динамо Мн. — 1:0, Шахтер — Молодечно — 1:0



ТУРНИРНАЯ ТАБЛИЦА

ПОСЛЕ 3-ГО ТУРА

		И	В	Н	П	М	0
1.	БАТЭ (Борисов)	3	3	0	0	7-3	9
2.	Динамо-93 (Минск)	3	2	1	0	9-1	7
3.	Торпедо (Минск)	3	2	1	0	6-2	7
4.	Динамо (Брест)	3	2	1	0	4-0	7
5.	Гомель	3	2	1	0	4-1	7
6.	Днепр-Трансмаш (Могилев)	3	2	0	1	5-2	6
7.	Торпедо-Кадино (Могилев)	3	2	0	1	5-3	6
8.	Славия (Мозырь)	3	1	1	1	2-5	4
9.	Шахтер (Солигорск)	3	1	1	1	2-5	4
10.	Нафтан-Девон (Новополоцк)	3	1	0	2	4-5	3
11.	Белшина (Бобруйск)	3	1	0	2	1-2	3
12.	Локомотив-96 (Витебск)	3	0	1	2	1-3	1
13.	Неман (Гродно)	3	0	1	2	1-5	1
14.	**Коммунальник (Слоним)**	**3**	**0**	**1**	**2**	**1-6**	**1**
15.	Динамо (Минск)	3	0	1	2	1-6	1
16.	Молодечно	3	0	0	3	1-5	0

СЕЗОН-98 СЕЗОН-98 СЕЗОН-98 СЕЗОН-98 СЕЗОН-98

ЗАХАПЛЕННЕ

«Западный участок»



Недавно среди слонимских музыкальных групп появился новый коллектив «Западный участок». Хотя были и рабочие названия: "Веселый пончик", "Отрок". В составе группы четверо ребят 15-18 лет: Леша Высоцкий (бас-гитара), Сергей Касьяненко (вокал), Коля Алабушев (ударник) и Макс Маслов (ритм и бэк-вокал).

—Ребята, расскажите о своей группе: чья идея создать ее, в каком стиле вы играете?

—Создать группу предложили Леха и Сергей. Раньше каждый играл в своей группе, так что опыт есть. Главной причиной, которая послужила толчком к ее созданию, было желание создать хорошую группу в маленьком городе и, конечно же, не скучать. Стиль точно определить пока не получается: играем то, что нравится. Наша музыка — и панк, и рок, и гранж. Участники группы все равны — нет главных и подчиненных. Мнение каждого имеет свой вес: если кто-то против, решение принято не будет.

—Я знаю, что вы поете только свои песни. Кто пишет стихи и музыку?

—Стихи, в основном, пишет Леша, музыку сочиняем все вместе. Чтобы песня "пошла", конечно же, должно быть определенное настроение. Например, настроение ужасное, а стихи выходят лирические, и наоборот: все хорошо, но песни получаются пессимистические. Никогда не пишем о каком-то конкретном событии, мы это пропускаем через себя, переживаем, поэтому музыка и слова у нас — единое целое.

—Воспринимает ли вас публика так, как вам хотелось бы?

—Мы думаем, что понимают нас не многие. Для большинства наша музыка в диковинку. Нам нравится, когда публика реагирует на песни: в зале свист, шум, крики. Когда же люди сидят и молча слушают, а потом жидко аплодируют, тогда пропадает всякое желание петь для них.

—Где вы учились играть?

—У всех у нас был один учитель — улица. Где-то кто-то показал, как надо играть и мы играем. Хотя музыкальную школу окончить не мешало бы. Сергей, например, хочет научиться играть на скрипке. Леше не нравится его голос — надо учиться чище петь. Но мы считаем, что для наших песен голос замечательный, никто другой лучше не споет.

—Чем вы занимались до того, как увлеклись музыкой, и какие планы на ближайшее будущее?

—Раньше все занимались спортом, но музыка у нас была на первом месте, да и в будущем — только музыка. Надеемся, что скоро можно будет рассчитывать на новый концерт. Петь будем только свои песни, наш стиль жизни: музыка, пиво, веселье.

—Расскажите немного о своей жизни.

—Наш лозунг: "Молодежь — без политики!". Поэтому ни в каких политических молодежных организациях не состоим, также считаем, что деньги в жизни не главное. Лично нам они нужны только на инструменты и аппаратуру. За помещение, в котором мы репетируем, расплачиваемся концертами. Но мечта — выступать там, куда позовут и где поймут.

—А как же родной город?


—Слоним — город хороший, но слушателей здесь мало. Однообразие убивает.

—Скажите, вы собираетесь регистрировать свою группу?

—Конечно. У нас есть идея создания "Клуба аматараў беларускага року". Придумали уже и герб, и символику, но с документами разобраться пока не получается. Думаем, что в "Клуб" согласятся войти многие рок-группы города, хотя близких нам по духу и по стилю пока нет.

Беседовала
Елена СИНЯК

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ! Калі вы жадаеце, каб ваша аб'ява была вылучана з агульнага тэксту, мы прапануем аформіць яе ў рамку. Гэта паслуга будзе каштаваць 70 тысяч рублёў, і тэкст вашай аб'явы БЯСПЛАТНА будзе рамешчаны ў газетах "Пагоня" і "Биржа информации" (г. Гродна і Гродзенская вобласць). Па вашай просьбе аб'яву мы можам паўтарыць у наступным нумары. Упрыгожанае віншаванне каштуе 100 тысяч рублёў, а віншаванне з фатаграфіяй — 130 тысяч.



Літаратурны ВЕТРАЗЬ

Мікола АРОЧКА

Душа роднай мовы

У мовы маёй, нібы ў чалавека, —
Прыгожае цела, жывая душа.
То ж вам не чужацкі жаргон-недарэка
З нахабствам прыблуды і прыбыша.
У ім, як забруджаным лесе, — ў жаргоне:
Бляшанкі, бутэлькі, лаўжы, як вужы.
А родную нашу, хоць вечна ў загоне,
Ратуе жывучасць яе душы.
Як "чыкае" з форсам жаргон бюракрата,
Пагарда чынуш задзірае насы.
Ды дзіўна: іх штаты і ўсе апараты
Твора не створаць сапраўднай красы!
Жаргон — напракат! — для экспансій прыдатны,
А твору ж патрэбна крынічка душы,
Народнай душы — і спагады, і праўды,
І моўнай душы, што не ўздзецца на крыжы!
"Трасянка" — калечанне моўнага цела,
Шрамаў на ім не злічыць і рубцоў!
Але пад рубцамі трымціць, як трымцела,
Душа — адной з самых прыгожых моў!
Яна, пэўна, ў квантах нябачных разліта,
То вымкне са спадчыны звонам, слязой,
То ўзыйдзе травой, стане зернямі жыта,
То гукамі слоў, што палоняць красой.
Здаецца, красе, патаптанай, абнылай,
Не ўстаць з бездухоўнай цямноты-глушы.
Ды чую — пульсуе творчая сіла,
Нязводная сіла моўнай душы!

1998, в. Вецявічы

Абвучаю каня

Чэславу Шмігіру, старшыні калгаса

І навошта я зноў нешта ладжу і шыю?
Гэта ж збрую рыхтую, як нейкі абсурд.
Не каню адзяваю хамут я на шыю,
Я сабе адзяваю хамут.
Я нарэзаў для збруі пасаў са скуры —
Для набэдрыкаў, лейцаў, супонь.
Ах, мой конь, ты, напэўна, нашчадак буры —
Не даецца ў прыгонніцтва вупражы
Конь.
Старшыня наш зычлівы каня даў на выбар:
Абвучы — і на волю з Пегасам скачы!
Толькі ласкай бяры... Ды мой конь, як "тыгар",
Не хацеў, як паэт, свой прымус валакчы...
Можа, лепей было б пахадзіць напачатку
Пры старым лашаку — на малым павадку,
Супыняць трохі пугай гудлівасць азадку,
Чым лавіць яго ў мыле на дзікім скаку...
Помню нораў круты аднаго жарабка:
Каб накінуць хамут, бацька лез на палаткі.
Вось і конь мой гарцуе са мной на дыбках.
Пачаплю бервяно — хай цалуе ў пяткі...
Ах, шаленец, не рві наравіста пастронкі.
Бачу іскры ў яго са слязою з вачэй.
Ты за воляй сваёй не скачы наўздагонкі.
Спачуваю. Прашу. А мне ці лягчэй?
Набрыкаўся і ўпрэў... Дзе ты дзенешся, косю?
Луста хлеба з далоні — вось мы і ў ладу.
Каб цябе запрыгоніць хамутнай міласцю,
Мо пад колам вазка галаву пакладу...

1997, в. Вецявічы

Ольга КАЛИНЕВИЧ

***

Хочешь воды напиться?
Копай глубже!
Хочешь снова родиться?
Копай глубже!
Хочешь быть счастливым?
Копай глубже!
Хочешь жить по мотивам?
Копай глубже!
Не проклинай лопату,
Черную землю рой.
Счастья хочешь?.. Тогда ты
Копай глубже, не ной!

Вольга ВІЛЬКОЎСКАЯ

***

Я жыццё перасаліла.
І не ведаю, чаму.
Сэрца нешта зашчыміла,
Боль нiяк я не здыму.
Мне здаецца, ўсё як след,
Па дарозе шпарка крочу.
І вось раптам — многа бед,
Як пясок — у вочы.
Ну, чаму мяне мінае
Той адрэзак у жыцці,
Што ўсім дапамагае
Па прамой ісці?

Марыя ЗЕНАВА

***

Жыццёвы шлях, які ты будзеш?
Ад думак квеліцца душа,
Як сцежка,
што у лесе блудзіць,
Як беларуская шаша.

У кожнага свой шлях асобны,
Ён, як дарожка у двары,
Самотны,
часам непраходны,
Бяжыць і зоркамі гарыць.

АДБЫЎСЯ З'ЕЗД ПІСЬМЕННІКАЎ

У Мінску, 23 красавіка, адбыўся дванаццаты па ліку з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі.

На ім з болем у сэрцы вялася размова пра складанае становішча беларускай мовы, пра падзенне тыражоў беларускамоўных кніг, пра закрыццё беларускамоўных класаў і школ. Ішла гутарка і пра Дом літаратара – месца яднання пісьменніцкіх сіл у Мінску. Справа ў тым, што гэты будынак хоча забраць сабе адміністрацыя прэзідэнта, а пісьменнікаў выгнаць на вуліцу.

Дэлегатамі з'езда было вылучана 9 кандыдатур на пасаду старшыні Саюза, аднак 8 з іх узялі самаадвод. А старшынёй рады Саюза пісьменнікаў Беларусі быў абраны паэт Уладзімір Някляеў.

БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР

Два гады назад у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі была распрацавана серыя "Беларускі кнігазбор".

У гэтай серыі ўжо выйшлі з друку творы Яна Чачота, Максіма Багдановіча, Вацлава Ластоўскага, беларускія летапісы і хронікі, зборнік "Філаматы і філарэты". А нядаўна пабачылі свет выбраныя творы Уладзіміра Жылкі – цудоўнага беларускага паэта, які быў рэпрэсіраваны і памёр у 33-гадовым узросце. Дарэчы, у 1916 годзе Уладзімір Жылка закончыў Слонімскую вышэйшую пачатковую школу, пасля якой вучыўся ў Ковенскай сельскагаспадарчай вучэльні.

Кнігі залатой серыі "Беларускі кнігазбор" можна набыць у кнігарнях Мінска.

ПАЭТЫЧНАЯ "ТРЫБА"

Наш зямляк з Чамяроў Іван Чыгрын выдаў у Мінску свой новы паэтычны зборнік з арыгінальнаю назваю "Трыба".

Яго склалі вершы, якія паэт прысвяціў роднай зямлі, каханню і праблемам сённяшніх дзён.

Фундатарамі "Трыбы" сталі сястра Марыя, сябра Ф.Рутkоўскі, Слонімскія вінзавод і камвольна-прадзільная фабрыка.

Наталья КИСЛЯК

***

Ты попросил тепла.
Но сколько?
Слеза вдруг потекла.
Позволь-ка.
Играешь верой зла,
Надеждой.
Судьба свое взяла,
Как прежде.
В суровых уздах дня
Не бойся,

А доброте не зря
Откройся.
В прозрачных небесах
Высоких,
Несбывшихся мечтах
Далеких,
Ты растворись в огне,
Как в чувствах.
В душевной глубине
Не пусто.

***

Как-то не по-простому
Умолкает дорога.
Все, что нужно живому,
Я храню у порога.
И пройдя сотни бед,
Обожгу я себя
Через несколько лет,
Вспоминая тебя.
Жизнь отточил пером
И невинно, и строго.
Пьем мы молча вдвоем.
Нас осталось немного.
По-мужски нас обнимет
Раскаленный песок.
Но никто не отнимет
То, что сердцем сберег.

***

Постою, помолчу,
Может кто-то вдали,
Мне подарит свечу
И попросит: зажги.

Я дотронусь огня,
Я бокал разобью.
Я закрою глаза.
Боже, как я люблю.

Постою, помолчу,
Укрываясь теплом.
Ничего не хочу,
Лишь уснуть
вечным сном.



Фота IREX/Promedia

Помнік Адаму Міцкевічу ў Навагрудку

Клавдия ЩЕРБАКОВА

Весна

Тихий шепот листвы молодой
По аллее туманной катился.
Свежесть утра воспел золотой
Жавороночек, взвился и скрылся.
Изумрудных лугов и садов
Терпкий запах нахлынул в окошко.
Глядь: зима белоснежная вновь
Пробежала весной по дорожке.
Осыпала жасмин и сирень
Лепестками воздушными, легкими...
—И меня понарядней одень! —
Попросила черемуха вздохом.

Юрась НЕРАТОК

Кплівае прызнанне

Люблю цябе, народ мой памяркоўны,
за твой працоўны сверб і нораў роўны;
за тое, што не патрабуеш грошы,
а цягнеш воз свой і крадзеш патрошкі;
за тое, што начальства паважаеш,
што здзеку над собой не заўважаеш;
за звычку, што характар твой стварае:
каб хатка між людзей, а хлеўчык з краю;
за простую, як ношка сена, сутнасць,
за тое, што ты супраць тых, хто "супраць",
за тое, што і ў слова і ў паперку
ты верыш калі кажа той, хто зверху;
за тое, што ты за сябе хітрэйшы —
што ты не беларускі, а тутэйшы.

Літаратурны ВЕТРАЗЬ

Анатоль ІВЕРС

Даволі жыць, як набяжыць

Пражыў не мала і не многа.
І, колькі помню, цісну "лад".
Мая жыццёвая дарога,
Куды ж цяпер ты прывяла?
Я помню вёсачку ў дваццатых
Пасля вяртання ў родны дом.
Асот узняўся каля хаты,
Пераплятаўся з лебядой.
Хоць голад быў,
ды з лебядою
Перажылі тую пару,
Перажылі ліхую долю,
Што агарнула Беларусь.
Ад Негарэлага на захад
Яднала мова нас свая.
І колькі б не зазналі жахаў,
Сусед быў шчыры, як сваяк.
За школу родную, бывала,
Ішлі на бой, як за зямлю.
Таму не здолеў "ожэл бялы"
Запаланіць працоўны люд.
Прайшло яшчэ
паўсотні вёснаў,
Дзе "беларускі" ёсць урад.

Але чаму на сэрцы млосна
Пад крыкі вылюдкаў "ура"?
А дзе той росквіт
роднай мовы?
А дзе "заможны" дабрабыт?
Сярпом падрэзалі асновы
І молат цэліўся: "Рабі!".
Пайшло жыццё
апошняй пробы.
Куды ўжо далей — няма сіл.
Яшчэ на край
напаў Чарнобыль,
Прасі ратунку — не прасі.
Гляджу на выцвеўшае неба,
Дзе пачынаюць птушкі дзень.
Кажу братам,
што выжыць трэба,
Як пры няшчаснай лебядзе.
Зямлю аддайце —
будзем сеяць.
Аддайце школу —
будзем жыць.
Я не паляк і не расеец,
Даволі жыць, як набяжыць!

Родная мова

Даюць нам зоркі і крыжы
Пасля знішчальнага кастра...
О, мова родная, скажы,
Чаму мне добра сярод траў?
Чаму іду я ў гай густы
Паслухаць песні салаўя?
А мо спяваеш гэта ты,
Каб заблудзіўся ў нетрах я?
Ды не ўцяку я ад пакут,
Мне трэба крыху адпачыць.
І ў нашу радасць — родны кут
Не дам, каб лезлі крумкачы.
Даўно не чуў, каб конь іржаў,
А гэта — прызнакі дабра.

Знішчае дзесь касу іржа,
Касу, што вораг адабраў...
Гуртуй жа, мова, на зары
Ўсіх беларусаў навакол,
Каб нашы душы азарыць,
Каб вырвацца з бяды, акоў!
Цябе ж знявечвалі, пяклі,
Каб ты крычала ім "ура".
Наш Каліноўскі і ў пятлі
З "Мужыцкай праўдай" паміраў.
І Тарашкевіч так, як сцяг,
Трымаў "Граматыку" ў руках...
І мова ўстане на касцях
І разліецца, як рака!

НОВЫЯ ВЕРШЫ МІКОЛЫ КАНАНОВІЧА

Каханне

Спапяляецца грэх, спапяляецца крык,
Спапяляецца сонца і маладзік.
У гэтым агні спапяляецца ўсё
І... нараджаецца зноўку жыццё.

* * *

Зазначыла маці: "Цёпла..."
Курыныя галасы
Запаўняюць прастор завокны
Гімнам вясновай красы.
Вярнулася Дабравесце
На дрэвы, на дахі хат.
І сонечны промень лезе —
Нахабнік — у мой палац.
Іскрынкай, жарсцінкай поўні,
Поўнай поўніцы пачуцця,
Бог вясны сэрца мне напоўніў
З вачэй мілай святлом жыцця.

* * *

У позірку тваім — туман.
У словах — прага насалоды.
У крыку —
кліч тваёй прыроды,
Што разняволіла свой стан.
І я люблю ТАКІЯ вочы,
І словы песняй мне гучаць,
І не магу я перарваць
Твой крык шчаслівы
позна ўночы...
І ў дзённых клопатах жаночых
Ты ўмееш, як ніхто, кахаць.

* * *

Вясна ўтапілася ў табе.
Тваё імя я паўтараю,
І поўніцца душа да краю
Напоем шчасця пакрысе.
Экзальтаванасцю надзей
З прыродай
разам ажываю
І ўжо забытае: "Кахаю!" —
Шапчу я ля тваіх грудзей.
Калі б нам бачыцца часцей
І піць салодкі водар шчасця,
Было б жыццё
зямным прычасцем
Сярод зняверaных людзей.

* * *

Вы прысніліся мне, ці не?...
Рэчаіснасць азмрочана снамі.
Я сябе не ўяўляю ўжо з Вамі,
І без Вас жыць
не можацца мне...
Канае душа ў журбе,
І надзея бяжыць ручаямі,
Бо вясна
пралягала паміж намі
Астравамі двума ў вадзе.
І шляху няма нідзе,
А стыхія падманам цягне.
Ці дабудзем мы да спаткання
У той час, як вада спадзе?

Старонкі падрыхтаваў Сяргей ЧЫГРЫН

Аляксей ЯКІМОВІЧ

БЫЧОК

Апавяданне

1

Дождж ліў як з вядра. Бліскала маланка, раз-пораз, паўтараючыся, як рэха грымеў гром. У агародчыку гнуліся ад ветру вішні і яблыні.

У доўгім, да самых пят, плашчы ён падыйшоў да хлява і адчыніў дзверы. Яны працяжна зарыпелі. Ён прыслухаўся. Дзесьці зусім блізка бліснула маланка і грымнуў гром. Угнуўшы галаву ў плечы, ён таропка ўвайшоў у хлеў і ўключыў ліхтарык.

У загарадзе ляжалі карова і лысенькі, з белай плямай на лобе, бычок. Карова павярнула да яго галаву і махнула ёю, як бы вітаючыся.

Ён дастаў з-пад плашча вяроўку і, зрабіўшы пятлю, надзеў яе бычку на шыю. Бычок рэзка адступіўся назад і захроп: пятля здушыла яму горла. Гучна зарыкала карова.

—Хадзем, лысенькі, хадзем! — ласкава прагаварыў ён, далонню стукнуўшы бычку па баку. Бычок выскачыў на двор, пад дождж.

Ён зачыніў дзверы, падняў з зямлі дубец і, трымаючы ў руцэ вяроўку, пагнаў бычка перад сабою.

На яго нечакана напаў страх. Калі бліскала маланка і з трэскам грымеў гром, ён, хутка-хутка перабіраючы губамі, паціху прасіў Бога:

—Божа, дапамажы мне! Божа, не карай мяне!

Ён не маліўся, ён проста прасіў, бо ніводнай малітвы не ведаў.

За вёскай яго чакалі двое: высокі і каржакаваты, шыракаплечы.

—Прывёў? — зарагатаў высокі.

—Прывёў, — буркнуў ён.

—Вельмі не бядуй, — сказаў каржакаваты. — На наступны год карова другога бычка вам прывядзе.

Ён усунуў у руку каржакаватаму вяроўку і пальцам правёў па белай плямцы бычка.

—Бывай, лысенькі.

2

Аксана ўстала на досвітку. Сонца яшчэ не ўзышло. У хаце было ціха-ціха. Толькі на сцяне мерна цікалі ходзікі. «Сцяпан сёння раней за мяне ўстаў. Напэўна, на двор падаўся, каб праверыць, ці навальніца бяды не нарабіла», — падумала пра мужа Аксана. Ноччу доўга ліў дождж, шалеў вецер, бліскала маланка і грукатаў гром. Зморaная за дзень, яна заснула пад гэту незвычайную музыку навальніцы. Аксана ўзяла даёнку і выйшла з хаты. На падворку дзе-нідзе стаялі калюжынкі. У агародчыку ляжалі лісты, галінкі вішань, яблынь, адарваныя і адламаныя ветрам, а зямля пад яблынямі была ўсыпана зялёнымі, няспелымі яблыкамі.

—Божа! Пабіла-паламала як перад канцом свету! — вырвалася ў Аксаны. Яна пастаяла і, босымі нагамі ступаючы па цёплых калюжынках, накіравалася да хлява.

—Божа! — зноў вырвалася ў яе, калі яна адчыніла дзверы хлява. У загарадзе, жуючы жуйку, стаяла адна карова, бычка там не было «Сцяпан яго павёў на лужок, што за агародам, дзе бычок звычайна пасвіцца на ланцугу, падвязаны да калка!» — прабегла ў галаве. Аксана выглянула з-за хлява. На лужку хадзілі толькі суседавы куры.

—Віта-алі-ік! — гукнула Аксана, клічучы сына.

3

Віталік спаў на гарышчы на духмяным сене, якое нядаўна прывёз бацька, накасіўшы каля лесу.

—Віталі-ік! — данёсся да яго голас маці.

Віталік на карачках падпоўз да дзверцаў, якія былі ў шчыце гарышча, і гукнуў, незадаволены:

—Ча-го-о?

—Віталік, злезь. Наш бычок з хлява прапаў.

Віталік нагою штурхнуў у дзверцы і па драўлянай лесвіцы стаў злазіць з гарышча.

4

—Маці, ты жартуеш? — пазяхнуўшы, распачаў размову Віталік.

«За ноч не выспаўся ты, сынок», — падумала Аксана і тыцнула рукой, паказаўшы на хлеў.

—У хляве няма лысенькага. Адна карова там стаіць. Сам паглядзі, калі мне не верыш.

Віталік паглядзеў на хлеў і махнуў рукою.

—Можа, вы яго ўчора з лужка не прывялі?

—Я сама бычка адвязала і прывяла. Ты ж не прывядзеш. Табе няма калі. Усё ў горад да сябрукоў ездзіш.

—Маці, ты, можа, думаеш, што я бычка ўкраў? Дык у міліцыю звані. Няхай мяне ў турму, за краты, на дзесяць год пасадзяць.

—Сынок, не кажы абы чаго! Ты ж у мяне адзін, як палец, — жахнулася Аксана. — Я цябе паклікала, бо бацькі дома няма. І ён прапаў.

—Бацька, я думаю, сена пайшоў касіць, — разважыў Віталік.

—Не, — не пагадзілася з ім Аксана. — Калі б сена пайшоў касіць, то вечарам касу накляпаў бы. Сынок, што мне рабіць? Парай.

—У міліцыю пазвані. Няхай участковага Міхайлавіча прышлюць, — сказаў Віталік і, пазяхаючы, паплёўся ў хату.

5

Участковы, старшы лейтэнант Панцялей Міхайлавіч (у вёсцы яго звалі Міхайлавічам), прыехаў у адзінаццаць гадзін. Міхайлавіч жыў у горадзе, у раённым цэнтры, дзе меў кватэру. Год засталося яму да пенсіі, а служыць стала вельмі цяжка. У апошні час ціхіх, спакойных вяскоўцаў як падмянілі. Напіваюцца, б'юцца, калгаснае дабро крадуць. А гэтай ноччу ўкралі бычка ў Сцяпана Гаўрусёва. Каб у людзей жывёлу кралі! Такога яшчэ не было.

Паставіўшы каля плоту матацыкл, Міхайлавіч зайшоў на панадворак. З хаты выбегла Аксана. Віталік, які быў на панадворку, сеў на лаўку і закінуў нагу на нагу.

— Міхайлавіч, — са слязамі на вачах прамовіла Аксана, — нашага бычка ноччу з хлява ўкралі.

— Аксана, дзе твой Сцяпан? — запытаўся Міхайлавіч. Вясковых мужчын і маладзіц ён звычайна называў па імені.

— Няма, — развяла рукамі Аксана.

— Бычок прапаў, і бацька прапаў, — засмяяўся Віталік.

— А ты не смейся, — звярнуўся да яго Міхайлавіч. — У вёсцы бачылі і мне паведамілі, што дзяцюк у доўгім плашчы ноччу вёў па вуліцы бычка. Гэты доўгі плашч называецца плашч-палаткай.

— Ого! — прамовіў Віталік.

Міхайлавіч звярнуўся да Аксаны:

— Аксана, у вас ёсць плашч-палатка?

— Такі плашч ёсць, — разгубілася Аксана. — у сенях ляжыць. Здаецца, яшчэ мокры.

Віталік ускочыў з лаўкі.

— Міхайлавіч, плашч-палатку бацька мог адзець.

— Сынок, ты думаеш, што твой бацька свайго бычка ўкраў? — разгубілася Аксана.

— Я нічога не думаю. А Міхайлавіч няхай падумае.

На твары ў Міхайлавіча захадзілі скулы.

— Вось што, хлопец. У горадзе з карцёжнікамі цябе часта бачаць.

— Гуляць у дурня яшчэ не забараняецца, — агрызнуўся Віталік.

— Але ж карты да дабра не даводзяць. І я гэта табе дакажу. — Міхайлавіч узяўся рукою за сумку, якая вісела ў яго на плячы.

6

Сцяпан стаяў за хлявом. Ён чуў усю гэтую размову. Убачыўшы, што Міхайлавіч узяўся рукою за сумку, ён выйшаў з-за хлява.

—Міхайлавіч, пачакай. Пратакол складзеш не на сына, а на мяне. Я ноччу вывеў з хлява бычка, я яго прадаў.

—А я што казаў! — рагатнуў Віталік.

Міхайлавіч прыўзняў фуражку.

—Сцяпан, ты бычка прадаў? Навошта?

—Пагуляць захацелася. Цяпер шмат хто ў вёсцы гуляе. А я хіба горшы?

—Сцяпан, грошы дзе? — запыталася Аксана. Яна ніяк не магла зразумець, што адбываецца тут, на яе падворку.

—Згубіў грошы. Забірай мяне, Міхайлавіч.

Міхайлавіч зірнуў на Аксану.

—Аксана, забіраць твайго Сцяпана?

Аксана замахала рукамі.

—Міхайлавіч, Бог з табой! Бог з табой!

—Самі разбірайцеся, калі так, — прамовіў Міхайлавіч і накіраваўся да матацыкла.

7

Калі Міхайлавіч схаваўся за паваротkай, Віталік сказаў:

—Бацька, не думай, што табе пашанцавала. Цяпер маці загрызе цябе.

Сцяпан з сілай правёў рукою па шчацэ, паморшчыўся.

—Сынок, давай у карты згуляем. У дурня.

—Бацька, ты не жартуеш?

—Не жартую, сынок.

Аксана села на лаўку. Яе рукі ўпалі на калені.

—Бычка прадаў, а цяпер з сынам у карты сабраўся гуляць!

